View metadata, citation and similar papers at core.ac.uk
brought to you by CORE
provided by Belarusian State Pedagogical University Repository

# МЕТОДЫКА РАБОТЫ НАД ТЭХНІКАЙ ВЫКАНАННЯ ТРАДЫЦЫЙНЫХ БЕЛАРУСКІХ НАРОДНЫХ ТАНЦАЎ ВА ЎМОВАХ СУЧАСНАГА ГОРАДА

*М.С. Аднадворцава, А.М. Шугаеў, Мінск, БДПУ*

На хвалі інтарэсу да этнаграфіі сёння фарміруецца прынцыпова новае стаўленне да народнага танца. Зварот да фальклору стаў выхадам з крызіснай культурнай сітуацыі. У наш час ёсць магчымасць паўдзельнічаць у палявых экспедыцыях, наладзіць стасункі з вясковымі жыхарамі, павучыцца «даўнейшым» танцам на вясковых вечарынах з бабулямі і дзядулямі, знайсці аўтэнтычных музыкаў.

Адначасова са знікненнем вёсак і аўтэнтычнага танцавальнага фальклору, традыцыйныя танцы развіваюцца ў горадзе, але не ў сцэнічным, а так званым «постаўтэнтычным» выглядзе. Народная харэаграфія стала нарэшце аб’ектам увагі фальклarыстаў-практыкаў, этнахарэографаў (С.Г. Выскварка, М.А. Козенка, у Расіі – Г.У. Емяльянава, І.В. Ахрамееў і інш.) і даследуецца як неад’емная, вартая вывучэння частка традыцыйнай народнай культуры.

Танец у спецыфічнай форме канцэнтруе ў сабе разнастайныя моманты жыццядзейнасці чалавека і разам з тым рэчаіснасць, якую ён адлюстроўвае. Праз навучанне народным танцам раскрываецца душа, псіхалогія нацыі. Як адзначае М.А. Козенка, у пластычных ідэях адлюстроўваюцца арыгінальнасць мастацкага мыслення беларусаў, характэрныя рысы ментальнасці, асаблівасці народнага светапогляду.

Спецыфіка тэхнікі выканання традыцыйных беларускіх народных танцаў ва ўмовах сучаснага горада базіруецца на пераемнасці вясковай, карэннай танцавальнай культуры. Для арганізацыі навучання традыцыйным танцам у горадзе неабходна не толькі ведаць, якія танцы папулярны ў вясковым асяроддзі, але і вытрымаць шмат умоў, каб захаваць іх характэрнасць і самабытнасць. Ніжэй прыводзяцца агульныя прынцыпы методыкі работы над тэхнікай выканання традыцыйных беларускіх народных танцаў (без уліку рэгіянальных асаблівасцей), складзеныя на аснове ўласнага вопыту вывучэння спецыяльнай літаратуры, удзелу ў этнаграфічных экспедыцыях і выкладання традыцыйных народных танцаў.

Адным з галоўных прынцыпаў з’яўляецца жывое навучанне традыцыйным танцам. Для сучаснага чалавека жывыя зносіны часам становяцца рэдкасцю, мяняецца тэмп і лад жыцця. Рухі гарадскога чалавека зусім непадобныя да рухаў чалавека вясковага, гэтак жа, як і мысленне. Лепш за ўсё, калі ёсць магчымасць павучыцца ў вясковых жыхароў сталага ўзросту, прасачыць за тым, як яны рухаюцца, патанцаваць разам з імі, адчуць саму атмасферу аўтэнтычнасці. Калі такі выпадак выключны, то трэба вучыцца ад тых майстроў, якія вучыліся непасрэдна ў народных танцораў. Зразумела, што ў сучасных умовах лёгка знайсці апісанні народнай харэаграфіі ў літаратуры альбо відэазапісы з палявых экспедыцый і вучыцца па іх. Але не трэба забывацца на тое, што ажывіць па нотах або паўтарыць з запісу танец можа толькі той чалавек, які ведае традыцыю.

Музычнае суправаджэнне таксама з’яўляецца паказчыкам адпаведнасці спецыфікі народных танцавальных вечарын. Неабходна, каб былі жывыя музыканты

РЕПОЗИТОРИЙ

з інструментамі, і пажадана, каб яны таксама вучыліся граць у народных выканаўцаў, маглі падбіраць мелодыі на слых і імправізаваць. Мінімальны варыянт для сучасных гарадскіх умоў – наяўнасць гарманіста або дудара, але лепш, каб быў яшчэ музыкант, які задае рытм. Увогуле, шматлікія аўтэнтычныя танцоры часта заўважаюць, што галоўны інструмент на танцах – гэта барабан (бубен). Пажадана, каб танцавальны рэпертуар складаўся з неапрацаваных народных найгрышаў і мелодый. Для пачатку гэта могуць быць самыя папулярныя ў народзе танцы, сярод якіх «Кракавяк», «Падыспан», «Полька-бабачка», «Матлёт», «Лявоніха», «Мяцеліца», разнастайныя полькі, вальсы і інш. Пажадана ўключаць у праграму вывучэння сольныя ці сольна-гуртавыя імправізаваныя танцы кшталту «Барыні», бо традыцыя грунтуецца на імправізацыях.

Арганічна займаць прастору падчас танцаў – таксама майстэрства, і гэтаму трэба вучыцца. У вясковых умовах у хаце магло круціцца ў польках дваццаць і нават больш пар, і ніхто адзін аднаго не кранаў і не падпіхваў. Гэта звязана напрамую і з танцавальнай манерай, і з характарам людзей, і ўвогуле з танцавальным этыкетам.

Танцавальны этыкет – аснова тэхнікі выканання традыцыйных беларускіх народных танцаў на вёсцы, і адпаведна ён павінны стаць такой жа асновай для традыцыйных танцаў ва ўмовах сучаснага горада.

Пры арганізацыі вучэбнага працэсу неабходна прытрымліваецца прапанаваных прынцыпаў. У дадзеным артыкуле мы прапануем праграму гуртка традыцыйнай культуры і фальклору для ўстаноў дадатковай адукацыі. Праграма накіравана на агульнакультурнае развіццё навучэнцаў і па свайму зместу з'яўляецца шматпрофільнай: яна ўключае спевы, танцы, тэатральныя заняткі, дэкаратыўна-прыкладное мастацтва. Гэта творчая праграма распрацавана Марыяй Станіславаўнай Аднадворцавай на аснове аўтарскай праграмы А.Ю. Лозкі «Юныя фальклярысты» [3].

Навізна праграмы гуртка традыцыйнай культуры і фальклору для ўстаноў дадатковай адукацыі заключаецца ў тым, што ў ёй улічана ўласнае бачанне прадмета засваення і асабісты вопыт працы з фальклорнымі матэрыяламі. Асаблівасць праграмы ў комплексным падыходзе да вывучэння традыцыйнай культуры. Заняткі ўключаюць танцы, спевы, гульні, народныя тэатральныя дзеянні, маляванне, дэкаратыўна-прыкладное мастацтва, вывучэнне традыцыйнага календара і адзення, прагляд этнаграфічных і фальклорных відэаматэрыялаў, праслухоўванне аўтэнтычных аўдыёзапісаў.

Праграма разлічана на 216 гадзін навучання, арыентавана на шырокае кола навучэнцаў. У групе могуць займацца 10–15 чалавек, заняткі разлічаны на 6 акадэмічных гадзін на тыдні (тры разы па 2 гадзіны). Арганізацыйныя формы работы: франтальная (калектыўная), групавая, індывідуальная. Асноўная мэта праграмы – далучыць дзяцей да традыцыйнай культуры Беларусі. Яе структура адпавядае структуры беларускага народнага календара. У працэсе навучання дзеці атрымліваюць фундаментальныя веды пра традыцыйныя каляндарныя святы (Багач, Каляды, Масленка, святы веснавога цыкла, Вялікдзень, Юр'е, Русалле, Купалле, Пятрок, жніўныя святы і інш.), асаблівасці іх святкавання, месца і час правядзення. Вывучаюць народныя песні, танцы і казкі, змогуць адрозніваць беларускі тнады-



РЕПОЗИТОРИЙ

цыйны строй сярод іншага адзення. Тэма «Традыцыйныя танцы» ўключае знаёмства з асновамі этыкету і асноўнымі элементамі беларускіх традыцыйных танцаў, асноўным танцавальным крокам – трохкрокам. Яна можа ўключаць прагляд відэафрагментаў з аўтэнтычнымі выканаўцамі, вывучэнне танцаў «Верабей», «Матлёт», «Журавель», «Таўкачыкі», «Полька-бабачка», «Падыспан», «Кракавяк» і інш.

Для рэалізацыі праграмы патрэбна прытрымлівацца пэўных метадычных ўмоў. Аптымальнымі формамі арганізацыі вучэбнага занятку будуць гуртковыя заняткі, выстаўка, спектакль, занятак-вандроўка, урок-гульня, творчая вечарына.

Апрабацыя праграмы адбылася на базе Дзяржаўнай установы адукацыі «Цэнтр дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі “Ранак”» г. Мінска (гурток «Раёк»), у Рэспубліканскім маладзёжным грамадскім аб’яднанні «Студэнцкае этнаграфічнае таварыства» ў практыцы арганізацыі фальклорных танцавальных вечароў, народна-масавых свят і забаўляльных мерапрыемстваў.

Праграма засваення спецыфікі тэхнікі выканання традыцыйных народных танцаў неабходна для далейшага навучання дзяцей і моладзі традыцыйным танцам у любой дзяржаўнай навучальнай установе як сродак падтрымання пераемнасці фальклору. Народны танец не можа разглядацца ў ізаляцыі, самастойнасці, без кантэксту ў межах народнай культуры. Ён шмат у чым вызначаецца асяроддзем, у якім развіваецца танцавальная культура, светаадчуваннем яго носьбітаў. Для падтрымання сістэмы традыцыйных народных танцаў ва ўмовах сучаснага горада неабходна выкарыстоўваць спецыфічную тэхніку яе засваення, павінна быць створана своеасаблівая методыка.

РЕПОЗИТОРИЙ

***Літаратура***

1. *Арлова, Г.П.* Беларуская народная педагогіка / Г.П. Арлова. – Мінск: Нар. асвета, 1993. – 120 с.
2. *Гуткоўская, С.В.* Гарадскія бытавыя танцы / С.В. Гуткоўская. – Мінск: Выд-ва «Чатыры чвэрці», 2008. – 140 с.
3. *Лозка, А.Ю.* Юныя фалькларысты / А.Ю. Лозка // Учебные программы для учреждений внешкольного воспитания и обучения и общеобразовательных учреждений. Туризм и краеведение / Н.К. Катович и [др.]; под общ. ред. С.С. Митраховича. – Мінск: Адукацыя і выхаванне, 2009. – 256 с.